УДК 347.77(476)(091)«18»

# СТАНАЎЛЕННЕ ІНСТЫТУТА АХОВЫ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ УЛАСНАСЦІ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XIX СТ.

**А. В. Бурачонак**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь; burachonak@bsu.by*

У артыкуле прааналізаваны працэс станаўлення патэнтнага права на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст. Ахарактарызаваны змест заканадаўчых актаў, з прыняццем якіх былі закладзены прававыя асновы аховы інтэлектуальнай уласнасці ў беларускіх і іншых губернях Расійскай імперыі. Прыведзены прыклады вынаходніцтваў і ўдасканаленняў, якія былі зроблены прадпрымальнікамі з ліку жыхароў Беларусі ў разглядаемы перыяд.

***Ключавыя словы:*** прывілея; патэнтнае права; Беларусь; вынаходніцтва; удасканаленне; Расійская імперыя; прадпрымальніцтва; вытворчасць; замежныя падданыя.

## СТАНОВЛЕНИЯ ИНСТИТУТА ОХРАНЫ ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНОЙ СОБСТВЕННОСТИ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В XIX В.

**А. В. Бурачонок**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь; burachonak@bsu.by*

В статье проанализирован процесс становления патентного права на территории Беларуси в XIX в. Охарактеризовано содержание законодательных актов, с принятием которых были заложены правовые основы охраны интеллектуальной собственности в белорусских и других губерниях Российской империи. Приведены примеры изобретений и усовершенствований, которые были сделаны предпринимателями из числа жителей Беларуси в рассматриваемый период.

***Ключевые слова:*** привилегия; патентное право; Беларусь; изобретение; усовершенствование; Российская империя; предпринимательство; производство; иностранные подданные.

## FORMATION OF THE INSTITUTE OF PROTECTION OF INTELLECTUAL PROPERTY OF ENTREPRENEURS IN THE TERRITORY OF BELARUS IN THE XIX CENTURY

**A. V. Burachonak**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus; burachonak@bsu.by*

The article presents analysis of patent law formation in Belarus in the XIX century. Legal foundations of intellectual property protection in the Belarusian and other provinces of the Russian Empire, as laid down in related legislative acts, are characterized. The paper also provides examples of inventions and improvements made by entrepreneurs from among the residents of Belarus in the XIX century.

***Key words:*** privilege; patent law; Belarus; invention; improvement; Russian Empire; entrepreneurship; production; foreigners.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі назіралася актывізацыя дзелавой актыўнасці мясцовых жыхароў. Яны праяўлялі сябе ў сферы прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, фінансаў і крэдыту, гандлю і інш. Па асобных напрамках прадпрымальніцкай дзейнасці жыхары беларускіх губерняў складалі дастаткова сур’ёзную канкурэнцыю для вопытных удзельнікаў агульнарасійскага рынку. Пры гэтым, дасягненне поспехаў тагачаснымі бізнесменамі і бізнесвумен цяжка ўявіць без выкарыстання разнастайных вынаходніцтваў і ўдасканаленняў, колькасць якіх з кожным годам няўхільна павялічвалася.

Характарызуючы перыяд XIX ст., варта адзначыць, што ён стаў не толькі часам актывізацыі мадэрнізацыйных працэсаў на тэрыторыі Беларусі [1, с. 41–42], але і з'яўлення новага тыпу людзей з іншым поглядам на традыцыйныя з'явы і працэсы. Менавіта гэтыя асобы імкнуліся матэрыялізаваць свае задумы ў выглядзе вынаходніцтваў і ўдасканаленняў, што ўрэшце адбівалася на мадэрнізацыі пэўных галін эканомікі. Высокую ступень важнасці і камерцыйнай каштоўнасці гэтых адкрыццяў з цягам часу сталі разумець і ва ўрадавых колах Расійскай імперыі, што вымушала апошнія да актывізацыі праватворчай дзейнасці па абароне інтэлектуальнай уласнасці шляхам выдачы прывілей – адмысловых дакументаў, якія давалі пэўным асобам магчымасць карыстання вынікам іх інтэлектуальнай дзейнасці як сваёй уласнасцю. Па сваёй сутнасці і зместу яны аддалена нагадвалі сучасныя патэнты. З цягам часу атрыманне прывілей набыла дастаткова масавы характар.

Прававая аснова развіцця інстытута аховы інтэлектуальнай уласнасці ў Расійскай імперыі, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі, была закладзена ў першай палове XIX ст. з прыняццем двух заканадаўчых актах. Першым з іх стаў «Маніфест аб прывілеях на розныя вынаходніцтвы і адкрыцці ў мастацтве і рамёствах» ад 17 чэрвеня 1812 г., у адпаведнасці з якім былі вызначаны парадак выдачы і спынення дзеяння прывілей, тэхнічныя патрабаванні заяўкі на іх атрыманне, памер пошліны, якая спаганялася на карысць дзяржавы за магчымасць абароны інтэлектуальнай уласнасці, а таксама працягласць дзеяння гэтых дакументаў [2, с. 355–356]. Нягледзячы на дадатковыя магчымасці, якія былі нададзены патэнцыйным наватарам вытворчага працэсу ў беларускіх і іншых губернях Расійскай імперыі, гэта быў толькі першы крок у кірунку стварэння інстытута аховы інтэлектуальнай уласнасці. І хоць праект Маніфеста 1812 г. у асобных палажэннях суадносіўся з тэкстам «Патэнтнага закона» – аднаго з самых дасканалых на той час у Еўропе заканадаўчых актаў у гэтай сферы, які быў прыняты 7 студзеня 1791 г. Канвентам рэвалюцыйнай Францыі, былі пэўныя нюансы мясцовага значэння, якія вымагалі далейшай прававой прапрацоўкі.

22 лістапада 1833 г. было прынята «Палажэнне аб прывілеях», змест якога не проста канкрэтызаваў, але і ў значнай ступені ўдасканальваў палажэнні дзеючага патэнтнага права. У прыватнасці, да ліку новаўвядзенняў варта аднесці магчымасць атрымліваць прывілеі не толькі на вынаходніцтвы, але і ўдасканальванні пэўных канструкцый. Дакумент, які засведчваў удасканаленне, мог быць выдадзены ў тым выпадку, калі была дасягнута дамова з аўтарам адкрыцця, або па заканчэнні тэрміну дзеяння першапачатковай прывілеі. Прадугледжваўся папярэдні разгляд зробленага адкрыцця на прадмет навізны спецыяльна ўпаўнаважаным дзяржаўным органам – Мануфактурным саветам. Паводле ўдакладненняў, якія былі ўнесены ў патэнтнае права, у якасці аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці не разглядаліся рэчы, якія маглі нанесці шкоду грамадству ці дзяржаўным даходам. Пры гэтым давалася магчымасць укараніць карысныя для дзяржавы вынаходніцтвы, якія былі зроблены і запатэнтаваны ў краінах замежжа, але ў Расійскай імперыі прывілеі на іх не былі выдадзены. Працягласць дзеяння патэнтаў заставалася ранейшай : мінімальна яна была абмежавана 3 гадамі, максімальна – 10. Пры гэтым удакладнялася, што на працягу вызначанага ўрадам тэрміна абавязкова павінна было адбыцца ўкараненне зробленага вынаходніцтва ці ўдасканалення. Па Палажэнню 1833 г. прадукт інтэлектуальнай уласнасці з дазволу ўрада мог быць перададзены іншай фізічнай асобе, але не кампаніі. Больш за тое, асобы, якія атрымалі патэнт не маглі станавіцца акцыянерамі ці пайшчыкамі адпаведных таварыстваў [3, с. 691–695]. Аднак ужо ў адпаведнасці з «Палажэннем аб кампаніях на акцыях» ад 6 снежня 1836 г. фізічныя асобы атрымалі магчымасць засноўваць прадпрыемствы ў форме асацыіраванага капіталу для ўкаранення сваіх вынаходніцтваў і ўдасканаленняў, на якія былі выдадзены прывілеі [4, с. 258–259]. Тым самым урад стымуляваў мясцовых эканамічна актыўных суб'ектаў гаспадарання не толькі да заснавання акцыянерна-паявых таварыстваў з выключнымі перавагамі [5, с. 57], але і да далейшай рэалізацыі іх творчых ініцыятыў.

Акрамя вышэйадзначанага, «Палажэнне аб прывілеях» нівеліравала адзін з фактараў, які дагэтуль стрымліваў падачу заявак на атрыманне патэнта

прадстаўнікамі незаможных слаёў грамадства – плату дастаткова адчувальнай па сваіх памерах пошліны. У адпаведнасці з Маніфестам 1812 г. за прывілею, якая дзейнічала 3 гады, неабходна было заплаціць у казну 300 руб., 5 гадоў – 500 руб., 10 гадоў – 1,5 тыс. руб. [2, с. 356]. З 1833 г. гэтыя сумы былі зніжаны да 90, 150 і 450 руб. адпаведна [3, с. 356]. Паніжэнне памераў пошлін, разам з агульным удасканаленнем заканадаўства, стала адной з прычын павелічэння колькасці выдадзеных актаў на абарону інтэлектуальнай уласнасці. Так, з 1812 па 1833 гг. на ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі было выдадзена 74 прывілеі, а за такі ж двадцацідвухгадовы перыяд з 1834 па 1855 гг. – 494 [7, р. 227–228]. Пры гэтым, калі вынаходніцтва ці ўдасканаленне па пэўных прычынах не апраўдвала сябе, і асоба, якая атрымала прывілею, фактычна ёй не карысталася, унесеныя ў якасці пошліны грошы з казны не вярталіся.

Заканадаўчымі актамі ад 1812 і 1833 гг. прывілеі быў нададзены фармальны статус закона, паколькі працэдура прадугледжвала праходжанне заяўкі на патэнтаванне праз Дзяржаўны савет і зацвярджэнне яе рашэннем імператарам [2, с. 356; 3, с. 693]. Фактычна, у асобных выпадках гэта прыводзіла да таго, што прывілея магла быць не выдадзена на вынаходніцтва ці ўдасканаленне, якое было зроблена ў той галіне гаспадаркі, якая з пункту гледжання ўрада не мела патрэбы ў новаўвядзеннях. У пэўнай ступені адысці ад прынцыпу «апякунства пэўных вытворчасцей» дазволіла прыняцце 30 сакавіка 1870 г. нарматыўнага акту «Аб змяненні парадку справаводства па выдачы прывілей на новыя адкрыцці і вынаходніцтвы», паводле якога ўсе справы па выдачы абарончых дакументаў былі перададзены ў веданне міністэрстваў. Так, рашэнні аб патэнтаванні вынаходніцтваў і ўдасканаленняў у галіне прамысловасці выносіліся як і раней Мануфактурным саветам Дэпартамента мануфактур і знешняга гандлю Міністэрства фінансаў, у галіне сельскай гаспадаркі – Дэпартаментам земляробства і сельскай прамысловасці Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. [6, с. 339]. Такім чынам, з унясеннем дапаўненняў у дзеючае патэнтнае права, з аднаго боку, была спрошчана працэдура разгляду прашэнняў на атрыманне прывілей, але з іншага боку, фармальна змяніўся і статус прывілеі – з закона яна ператварылася ў падзаконны акт.

Далейшыя змены ў заканадаўства, якое забяспечвала абарону інтэлектуальнай уласнасці, былі ўнесены толькі ў канцы XIX ст. У адпаведнасці з прынятым 20 мая 1896 г. «Палажэннем аб прывілеях на вынаходніцтва і ўдасканаленне» прывілеі маглі выдавацца не толькі ўласна вынаходцу, але і яго праваператаемнікам. Для абароны інтэлектуальнай уласнасці пэўнай асобай падавалася прашэнне ў Дэпартамент гандлю і мануфактур, пры якім для разгляду грунтоўнасці пададзеных заявак на патэнтаванне з 1 ліпеня 1896 г. быў створаны Камітэт па тэхнічных справах, у склад якога ўваходзілі выключна спецыялісты з вышэйшай, пераважна тэхнічнай, адукацыяй [8, с. 455–456]. Інфармацыя аб выдачы пасведчанняў аб прывядзенні ў дзеянне вынаходніцтваў і ўдасканаленняў публікавалася ў «Весніку фінансаў, прамысловасці і гандлю» і «Урадавым весніку».

Змены, якія былі ўнесены ў патэнтнае права, закранулі і памеры пошлін. З гэтага часу ўсталёўваліся штогадовыя выплаты за дакумент, які пацвярджаў інтэлектуальную ўласнасць пэўнай асобы. За першы год дзеяння прывілеі спаганялася пошліна ў памеры 15 руб., за другі – 20 руб., трэці – 25 руб., чацвёрты – 30 руб., пяты – 40 руб., шосты – 50 руб., сёмы – 70 руб., восьмы – 100 руб., дзявяты – 120 руб., дзясяты – 150 руб., адзінаццаты – 200 руб., дванаццаты – 250 руб., трынаццаты – 300 руб., чатырнаццаты – 350 руб., пятнаццаты – 400 руб. Такім чынам, разам з агульным паніжэннем кошту дакумента на абарону інтэлектуальнай уласнасці павялічыўся тэрмін (з 10 да 15 гадоў), у які можна было ёй карыстацца. Змяніўся парадак выплаты пошлін. Грошы ўносіліся не адначасова за ўвесь час дзеяння прывілеі, а штогадова [8, с. 454]. Такім чынам, у выпадку, калі зробленае адкрыццё не прадэманстравала жыццяздольнасць, вынаходнік мог з лёгкасцю ад яго адмовіцца і мінімальна панесці фінансавыя страты.

Палажэнне ад 20 мая 1896 г. утрымлівала і пэўныя элементы сацыяльнаарыентаванага характару. Гэта праяўлялася ў тым, што падданыя Расійскай

імперыі маглі быць вызвалены ад выплаты пошлін у першыя тры гады дзеяння прывілеі ў выпадку, калі яны засведчвалі неналежнае матэрыяльнае становішча [8, с. 454]. Такім чынам, гэта сведчыла аб ініцыятыве ўрада па падтрымцы прадстаўнікоў бедных слаёў насельніцтва, якія мелі наватарскія здольнасці.

Яшчэ ў першай палове XIX ст. у Расійскай імперыі была замацавана норма, паводле якой права атрымання прывілеі на вынаходніцтва ці ўдасканаленне ў роўнай ступені мелі як мясцовыя падданыя, так і іншаземцы, незалежна ад таго, да якога саслоўя яны належалі [3, с. 692]. Законам не рэгламентавалася, але разам з тым і не забаранялася падаваць прашэнне на атрыманне прывілеі з дапамогай спецыяльных паверанных, таму на практыцы гэта было вельмі распаўсюджанай з'явай, асабліва сярод іншаземных просьбітаў. Гэты нарматыўны прабел быў ліквідаваны з прыняццем Палажэння ад 20 мая 1896 г., паводле якога падданыя іншых краін маглі звяртацца з прашэннем аб выдачы прывілей выключна праз асоб, якія жылі на тэрыторыі Расійскай імперыі, але пры гэтым не абавязкова з'яўляліся расійскімі падданымі [8, с. 455]. Варта адзначыць, што ўдакладненне норм адносна замежных просьбітаў у названым законе было нездарма. У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. падданыя іншых краін актыўна інвесціравалі ў эканоміку Расійскай імперыі. Пры гэтым інвестыцыі былі не толькі фінансавага, але і інтэлектуальнага характару. Сярод усіх атрымальнікаў прывілей на вынаходніцтвы і ўдасканаленні ў 1880 г. іншаземцы складалі 74 %, у 1885 г. – 78 %, у 1890 г. – 79 % [7, p. 129, 187]. Такая актыўнасць ці «вынаходніцкі бум» быў звязаны з тым, што адпаведна расійскаму заканадаўству замежныя падданыя маглі патэнтаваць сваю прадукцыю, якая ўжо была вядома за мяжой, але пакуль не ўкаранілася ў Расійскай імперыі. У гэтай справе высокую актыўнасць праяўлялі прадстаўнікі еўрапейскіх краін, асабліва французы, немцы і англічане. Увогуле ж, геаграфія саіскальнікаў на атрыманне прывілеі на вынаходніцтва ці ўдасканаленне ў Расіі была вельмі шырокай – ад Паўднёвага Мельбурна (Аўстралія) да штата Мічыган (ЗША). Сярод тых, хто атрымаў прывілеі на вынаходніцтва ці ўдасканаленне ў Расійскай імперыі былі вядомыя да гэтага часу ва ўсім свеце людзі – Томас Эдысан, Эміль Шкода, Готліб Даймлер, Густаў Эйфель і інш.

У айчыннай гістарыяграфіі лічыцца, што на тэрыторыі Беларусі першая прывілея на вынаходніцтва была атрымана прадстаўніком прадпрымальніцкай дынастыі Скірмунтаў. Сапраўды, 10 снежня 1830 г. Аляксандру Скірмунту была выдадзена прывілея на снарад для выпарвання цукровых раствораў з дапамогай пароў на плоскіх, паката-усталяваных паверхнях [9, с. 14]. Аднак, калі выйсці за рамкі сучаснай тэрыторыі Беларусі і ў якасці геаграфічных межаў выкарыстаць пяць беларускіх губерняў Расійскай імперыі, то высветліцца, што першым быў жыхар Віленскай губерні Гілер Маркевіч, які ў 1828 г. атрымаў прывілею на вынаходніцтва машыны для вырабу цэглы, дахоўкі і іншай прадукцыі з гліны [9, с. 11]. Крыху больш чым праз чатыры гады пасля А. Скірмунта, 12 лютага 1835 г., была выдадзена прывілея на 10 гадоў яшчэ аднаму жыхару Віленскай губерні, купцу першай гільдыі Вульфу Розінгу. Сутнасць гэтай прывілеі заключалася ў тым, што адзначаны купец набываў выключнае права на ўтрыманне параходаў для буксіроўкі суднаў па Бярэзіне, Дняпру і іншых рэках, якія ўпадалі ў першыя дзве. Акрамя таго, прадпрымальнік атрымаў выключнае права транспарціроўкі па названых вадаёмах правіянту, солі і іншых грузаў [9, с. 16]. Калі ўлічыць той факт, што ў гэты час пачынаюць распаўсюджвацца паравыя рухавікі на транспарце, то можна ўявіць, які кавалак атрымаў дадзены прадпрымальнік, зарэгістраваўшы прывілею.

У наступныя дзесяцігоддзі жыхары беларускіх губерняў працягвалі інтэлектуальна насычаць вытворчую сферу сваімі адкрыццямі. У прыватнасці, у 1879 г. землеўладальнік Магілёўскай губерні Аляксандр Энгельгард запатэнтаваў удасканаленне ў каўчукавых рысорах, правы на якое пазней былі саступлены Таварыству Расійска-Амерыканскай гумовай мануфактуры [10, с. 215]. Праз 10 гадоў А. Энгельгарду была выдадзена прывілея на вынаходніцтва спосабу злучэння экіпажных восей з кузавам пры дапамозе сістэмы рычагоў і рысор, якое перайшло ва ўласнасць той жа фірме [11, с. 26]. У 1891 г. уладальнік завода пры станцыі Вілейка

Віленскай губерні купец Эміль Посэль запатэнтаваў прыладу для вырабу падкоўных цвікоў [11, с. 92]. Цікава, што нават само прадпрыемства мела назву «Завод патэнтаваных цвікоў Посэля» [12, с. 391], што само па сабе ўжо стварала добрую рэкламу гэтай прадукцыі. Несумненна, што гэты піяр-крок стаў адным з фактараў, якія дазволілі ў будучыні названаму прамыслоўцу набыць у Санкт-Пецярбургу яшчэ адзін завод і ў пачатку XX ст. дасягнуць сумарнага паказчыка аб'ёму вытворчасці ў памеры звыш 1,3 млн руб. [13, с. 254, 315]. Безумоўна, гэтымі прыкладамі наватарская дзейнасць мясцовых прадпрымальнікаў не абмяжоўваецца. І магчыма жыхары беларускіх губерняў менш актыўна ў параўнанні з выхадцамі з Варшавы, Кіева, Адэсы, Рыгі і іншых гарадоў суседніх з нашай тэрыторый папаўнялі сваімі вынаходніцтвамі і ўдасканаленнямі фонд інтэлектуальнай уласнасці Расійскай імперыі, але сам факт вынаходніцкай дзейнасці сведчыць аб уключанасці гэтага рэгіёну ў працэс прамысловага перавароту, які з кожным годам набіраў усё большыя абароты.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Каханоўскі А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск : БДУ, 2013.
2. Манифест о привилегиях на разные изобретения и открытия в художествах и ремеслах от 17 июня 1812 г. № 25143 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 1 : в 45 т. СПб., 1830. Т. 32 . С. 355–356.
3. Положение о привилегиях от 22 ноября 1833 г. № 6588 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. СПб., 1834. Т. 8. Отд. 1. С. 691–696.
4. Положение о компаниях на акциях от 6 декабря 1836 г. № 9763 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. СПб., 1837. Т. 11. Отд. 2. С. 257–263.
5. Бурачонак А. В. Распаўсюджванне асацыіраванага ка-піталу на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Гісторыя. 2017. № 2. С. 54–61.
6. Закон от 30 марта 1870 г. № 41779 «Об изменениях порядка делопроизводства по выдаче привилегий на новые открытия и изобретения» // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. СПб., 1874. Т. 45. Отд. 1. С. 339–340.
7. Aer A. Patents in imperial Russia: A history of the Russian institution of invention privileges under the old regime. Helsinki : Suomalainen Tiedeakatemia, 1995.
8. Положение о привилегиях на изобретения и усовершенствования от 20 мая 1896 г. № 12965 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3 : в 33 т. СПб., 1899. Т. 16. Отд. 1. С. 453–458.
9. Журнал мануфактур и торговли. СПб.: Типография Ю.А. Бокрама, 1835. № 4. Отд. IV.
10. Указатель хронологический, предметный и алфавитный, выданных в России привилегий (за исключением выд. по М-ву гос. имуществ) с 1814 по 1883. СПб.: Тип. В. Киршбаума, 1884.
11. Указатель хронологический, предметный и алфавитный, выданных в России привилегий (за исключением выд. по М-ву гос. имуществ) с 1888 по 1891. СПб.: Тип. В. Киршбаума, 1892.
12. Указатель фабрик и заводов Европейской России: материалы для фабрично-заводской статистики. СПб.: Тип. В. Киршбаума, 1894.
13. Список фабрик и заводов Европейской России. СПб., 1903.


УДК 94(476)(091) «1810-1814»

## ПРОДАЖ ДЗЯРЖАЎНАЙ МАЁМАСЦІ Ў ГУБЕРНЯХ БЕЛАРУСІ ЯК СПОСАБ ПАПАЎНЕННЯ ДЗЯРЖАЎНЫХ ДАХОДАЎ У 1810–1814 ГГ.

**А. У. Ерашэвіч**

*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,*
*пр. Партызанскі, 26, 220070, г. Мінск, Беларусь; erash06@rambler.ru*

У артыкуле на аснове пераважна неапублікаваных матэрыялаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі паказаны механізм працэсу і фінансавыя вынікі ад продажу часткі дзяржаўнай пазямельнай маёмасці ў беларускіх губернях прыватным асобам у 1810–